УДК 001.4(476)

# МІКРАБІЯЛАГІЧНЫЯ ТЭРМІНЫ: СТРУКТУРА І ЎТВАРЭННЕ

**Асіпчук А. М.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Мікрабіялагічныя тэрміны шырока прадстаўлены ў біялагічнай, медыцынскай, сельскагаспадарчай, іншых прыродазнаўчых тэрмінасістэмах і маюць пераважна грэка-лацінскае паходжанне: *вакуоля, імунітэт, вакцына* (лац.), *бактэрыя, анаэробы, мікроб* (грэч.) і г. д. Як і ўся запазычаная лексіка, словы навукі выкарыстоўваюцца згодна з арфаграфічнымі, арфаэпічнымі, словаўтваральнымі, сінтаксічнымі нормамі беларускай літаратурнай мовы.

Паводле структуры можна вылучыць тры асноўныя групы мікрабіялагічных тэрмінаў:

а) тэрміны-словы, сярод якіх ёсць невытворныя (*ген, вірус, гамета* і пад.) і вытворныя (*бактэрыяфаг, транскеталаза, цытахромы* і пад.);

б) тэрміны-словазлучэнні: *фагацытарны паказчык, трансфармацыя бактэрый, біяхімія фіксацыі азоту* і інш.;

в) тэрміны-сімвалы (у склад тэрміналагічнага спалучэння, акрамя слоў, уваходзяць сімвалы, літары, лічбы, графічныя знакі): *вітамін* $B_{12}$, *вірус SV 40, β-акісленне, L-формы, мутанты* $O^c$ і пад.

Сярод спосабаў утварэння мікрабіялагічных тэрмінаў самым прадуктыўным з’яўляецца *сінтаксічны*. Найбольш распаўсюджаныя мадэлі словазлучэнняў пабудаваны па наступных схемах:

1) прыметнік + назоўнік: *клетачная абалонка, бактэрыяльная маса, латэнтны перыяд, сульфатнае дыханне, малочнакіслыя бактэрыі* і г. д.

2) прыметнік + назоўнік + назоўнік: *мікробная трансфармацыя рэчываў, кластрыдыяльная форма спор, таксічныя прадукты метабалізму* і г. д.

3) прыметнік + назоўнік + назоўнік + назоўнік: *ядавітыя прадукты жыццядзейнасці мікробаў, аморфная стадыя развіцця бактэрый, складаныя метады афарбоўкі мікробаў* і г. д.

4) назоўнік + назоўнік: *вірусы раслін, папуляцыя мікробаў, гетэрамарфоз клетак, знішчэнне мікраарганізмаў* і пад. У якасці залежнага кампанента могуць выступаць і ўласныя назоўнікі (прозвішчы навукоўцаў-даследчыкаў): *эфект Пастэра, раствор Люголя, тэст Ньюкомба, рэакцыя Вуда-Веркмана* і інш.

5) назоўнік + назоўнік + назоўнік: *хуткасць сінтэзу ферментаў, вірусы групы воспы, рэгуляцыя абмену рэчываў* і інш.

Пры *марфемным* спосабе тэрміны ўтвараюцца з дапамогай:

1) прыставак (прэфіксальны спосаб): *антытаксін, антывірус, антыцелы, дэрэпрэсія, дэсульфурацыя, дэзынфекцыя, рэкамбінацыя.* Дадзеныя тэрміны ілюструюць запазычаныя прыстаўкі *анты-, дэ-, дэз-, рэ-*, якія нясуць значэнне супрацьлегласці. Спосаб малапрадуктыўны.

2) суфіксаў (суфіксальны): *паразітызм, метабалізм, тулярын, таксін, туберкулін, плазмоліз, бактэрыёз, вірулентнасць, шаленства, браджэнне, узнаўленне, расшчапленне* (суфіксы *ізм-, ызм-, ін- ын-, із-,* ёз-, *асць-, ств-, энн-, енн-*) і інш.

Спосаб *аснова- і словаскладання* з’яўляецца прадуктыўным і рэалізуецца шляхам спалучэння:

1) элементаў грэка-лацінскага паходжання: *мікрабіялогія* (з грэч. мікра – ‘малы’, бія – ‘жыццё’, логас – ‘навука, вучэнне’), *фагацыт* (з грэч. фага – ‘пажыральнік’, цыта – ‘клетка’, ‘клетка-забойца’), *вірусалогія* (навука, якая вывучае вірусы, а больш дакладна з лац. вірус – ‘яд’, логас – ‘навука’), *аўтатрофы* і *гетэратрофы* (з грэч. аўта – ‘сам’, гетэра – ‘іншы’ і троф – ‘харчаваць’, класы мікробаў у залежнасці ад спосабу харчавання). Яшчэ прыклады: *клетка-донар, клетка-рэцыпіент, колі-індэкс, колі-цітр* (словаскладанне); *мікраарганізмы, бактэрыяхларафілы, макрамалекулы, гематаксін, фітапаталогія* (асноваскладанне) і інш.

2) уласнабеларускіх асноў: *хваробатворны, гнаяродныя* (інфекцыі), *жыццядзейнасць* (мікраарганізмаў) і інш.

Эфектыўным і лаканічным спосабам утварэння мікрабіялагічных тэрмінаў можна лічыць *абрэвіяцыю*. Напрыклад: *ДНК* – дэзаксірыбануклеінавая кіслата, *РНК* – рыбануклеінавая кіслата, *ЦТК* – цыкл трыкарбонавых кіслот, *ТК* – транскеталаза, *ВТМ* – вірус тытунёвай мазаікі і інш.

У цэлым, як слушна заўважае В. А. Ляшчынская, «для беларускай мовы пытанне аб утварэнні тэрмінаў асабліва актуальнае яшчэ і па прычыне абмежаванага ўжывання беларускай мовы ў сферы тэхнікі, многіх галін навукі, а як вынік гэтага – недастаткова распрацаваная і практычна рэалізаваная, ужывальная тэрміналогія» [1, с. 220].

Такім чынам, спосабы ўтварэння мікрабіялагічных тэрмінаў даволі разнастайныя, аднак ступень прадуктыўнасці вар’іруецца ад вельмі нізкай, як гэта відаць на прыкладзе прэфіксальнага ўтварэння, да высокай (сінтаксічны спосаб).

**ЛІТАРАТУРА**

1. Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка: вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / В. А. Ляшчынская. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2003. – 243 с.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т.: Галоўная рэдакцыя БелСЭ. – Мінск, 1977-1984.
3. Шлегель, Г. Общая микробиология / Г. Шлегель. – Москва: Издательство «Мир», 1972. – 477 с.
4. Эльберт, Б. Я. Микробы и вирусы / Б. Я. Эльберт. – Минск: Государственное издательство БССР, 1960. – 544 с.

УДК 008 (476.6)

# УВАСАБЛЕННЕ ІДЭАЛА МІНУЎШЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Гістарычная і сацыякультурная сітуацыя XIX ст. абумовіла цікавасць да праблемы ўдасканалення грамадства, пераасэнсавання грамадскіх ідэалаў у літаратурнай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў асяроддзі «краёвай» шляхты і інтэлігенцыі. Вызначальнае месца ў беларускай культуры XIX ст. займае ідэал мінуўшчыны, які адыгрываў функцыю пэўнай сацыяльнай матывіроўкі, што накіроўвала грамадскую думку і актыўнасць у напрамку вырашэння актульных для таго часу праблем: яднанне шляхты і сялянства ў барацьбе супраць рускага царызму, захаванне культурнай адметнасці. Праз мастацкую творчасць рэпрэзентавалася адчуванне самастойнасці гістарычнага шляху і ўсёй даўняй духоўнай спадчыны беларусаў, вызначаўся вектар далейшага сацыякультурнага развіцця.

Напрыклад, творчай канцэпцыі Я. Баршчэўскага ўласціва ідэалізацыя маладосці, абумоўленая не толькі асабістымі інтымнымі перажываннямі, але і аксіялагемай Радзімы.

Спробы ідэалізацыі канкрэтнага гістарычнага перыяда прасочваюцца ў «Спевах пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» Я. Чачота. У сваёй прадмове аўтар сцвярджае, што кожны народ «шукае ў попеле мінуўшчыны сваю славу, свае асаблівасці, даказвае, што і ён заслугоўвае пашаны з боку іншых» [3, с. 126].

Часта вяртаецца ў сваіх думках і мроях і вяртае сваіх герояў у свет мінулага, на Радзіму дзеля яе захавання А. Міцкевіч. У вяртанні дзяржаўнасці паэту бачылася адраджэнне народа, яго былой славы і моцы: «*Успамінаюць. Хто з вас не заплакаў / Ад радасці – бач, помняць нашу славу?! / А вернем славу – вернем і дзяржаву, / Бо з парастка пачатак дрэва волі*» [2, с. 26]. Вяртаецца ў дом свайго дзяцінства пасля